# «УСПАМІНЫ» Е. ФЯЛІНСКАЙ ЯК ПОМНІК МЕМУАРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТ.

**Я. В. Місько**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Минск;*
*yana.nesterova21@gmail.com;*
*навук. кір. – І. Э. Багдановіч, канд. філал. навук, дац.*

У артыкуле разглядаецца адзін з найбуйнейшых мемуарных твораў беларускай літаратуры XIX ст., які належыць пяру пісьменніцы і грамадскай дзяячкі Евы Фялінскай. З пункту гледжання істотных гістарычных і культурна-бытавых рэалій, якія афіцыйная гісторыя звычайна абмінае, яны дазваляюць зрабіць рэканструкцыю штодзённага жыцця прадстаўнікоў беларускай шляхты ў першай палове XIX ст., сяброўскіх і суседскіх стасункаў на фоне найважнейшых гістарычных падзей. Аўтар аналізуе страты і набыткі на гэтым шляху. Адзначаецца шматпланавая прысутнасць пісьменніцы ў тэксце і як гераіні апавядання, і як наратаркі, схільнай да абагульненняў, філасофскіх разважанняў, імкнення звязаць з’явы розных часоў прычынна-выніковымі сувязямі.

***Ключавыя словы:*** Ева Фялінская; мемуарная літаратура; беларуская літаратура XIX стагоддзя; апісальна-ўспамінальная плынь; эгадакументы.

Жыццёвы шлях Евы Фялінскай (1793–1859) выразна адрозніваецца ад традыцыйнага лёсу яе сучасніц. Ёй давялося зведаць ранняе сіроцтва і нястачу. Потым на дапамогу збяднелай сям’і прыйшоў сваяк Станіслаў Вяндорф, які ўзяў дзяўчынку на выхаванне ў свой заможны маёнтак на Случчыне. Поўнымі нялёгкіх клопатаў былі для Евы і гады замужжа з Герардам Фялінскім, праведзеныя ў яго радавым фальварку Ваютын на Валыні. Ужо ў сталым веку, аўдавеўшы, яна перабіраецца ў Крамянец, там далучаецца да падпольнай арганізацыі Шымана Канарскага і стварае яе філіял «Жаночае таварыства». За гэтым быў арышт у 1839 годзе, ссылка спачатку ў невялікі сібірскі горад Бярозаў, потым у Саратаў. Толькі ў 1844 годзе Е. Фялінскай дазволілі вярнуцца на радзіму.

Е. Фялінская выклікала ў сучаснікаў нязменную павагу сілай духу, жыццёвай трываласцю, загартаваным характарам і высокай грамадзянскай свядомасцю. Яна мела выключную назіральнасць, здольнасць да абагульненняў, а творчыя задаткі вымагалі мастацкага асэнсавання і адлюстравання пабачанага і перажытага [1, с. 122].

Е. Фялінская як асоба актыўная, з акрэсленай жыццёвай пазіцыяй, выразна дэкларуе ва «Успамінах» сваю грамадзянскую місію. Асноўнае сваё прызначэнне яна бачыць не столькі ў аднаўленні фактаў свайго жыцця, этапаў фарміравання ўласнай асобы, колькі ў стварэнні праўдзівага вобраза пераменлівага часу. На пачатку твора яна

падкрэслівае: «Пражыўшы шэсцьдзясят гадоў, далучыўшыся да розных грамадскіх слаёў, жывучы ў эпоху дзіўных і няпростых перамен не толькі ў нашым краі, але і ў іншых землях, я на свае вочы бачыла, як наша грамадства, падлеглае моцным знешнім і ўнутраным уплывам, раптоўна пераўтварылася, адкідаючы даўняе аблічча і набываючы новае. Можа, я здолею затрымаць сваімі ўспамінамі некалькі малюнкаў, якія цалкам зніклі з нашай зямлі, аднак з'яўляюцца тым звяном, што лучыць мінулае з цяперашнасцю, тлумачыць прычыну пераменаў, якія іх нарадзілі» [3, с. 6–7].

На яе думку, сведкі такіх імклівых змен, нясуць выключную адказнасць перад нашчадкамі, бо яны, як злучальнае звяно, павінны сваімі ўспамінамі звязаць розначасовыя з'явы пераўтварэння грамадства, «каб наступныя пакаленні не адракліся ад мінуўшчыны з настолькі інакшым абліччам і не глядзелі на яе з абыякавасцю, як на чужаземку, з якой не мелі і не маюць нічога супольнага» [3, с. 8].

Е. Фялінская называе сваю маладосць часам разбурэння. Прычыну ўсеагульнага заняпаду яна бачыць у безаглядным наследаванні заходнееўрапейскім узорам. Дэструкцыя пачалася са змены маральна-этычных арыенціраў, разбурэння старой сістэмы каштоўнасцей, адмаўлення ад нацыянальнай самавітасці. Яна сцвярджае: «Новыя павевы, запазычаныя традыцыі прынеслі краіне спусташэнне большае, чым татары, бо татары, разрабаваўшы, не знішчалі маральных нормаў. За імі ніхто не збіраўся ісці» [3, с. 419].

Памяць Е. Фялінскай зафіксавала апошнія праявы патрыярхальнага жыцця. Даўжэй за астатнія старыя звычаі трымаўся сярэдні слой шляхты, да якога належала сям'я яе дзядзькі Станіслава Вяндорфа. У яго доме Ева выхоўвалася з сямі гадоў да самага замужжа. Дзядзька свядома не пераймаў чужаземных павеваў і сваю гаспадарку ў Галынцы і прылеглых вёсках вёў па-ранейшаму. Здавалася, ён не праяўляў асаблівай актыўнасці, большую частку дня моўчкі седзячы ў гасцінным пакоі, але ўся гаспадарчая махіна, раз і назаўсёды запушчаная на пэўны лад, трымалася дысцыплінай, пачцівасцю і працавала бесперабойна. Фальварак функцыянаваў як натуральная самадастатковая гаспадарка, у якой нічога не прадавалася. Цукар, каву і віно, купленыя за жывыя грошы, падавалі толькі ў рэдкіх выпадках, асаблівым гасцям. Але ўсё, што мелі самі, ужывалі ў вялікім мностве – хапала і гаспадарам, і збяднелым сваякам, а рэшту, каб не псавалася, раздавалі па вёсках. Кожную нядзелю пасля імшы ў касцёле цётка запрашала на абед усю навакольную шляхту, не зважаючы, ці гэта заможны сусед, ці шляхціц «на загродзе». У Галынцы накрывалі багаты стол, які ўгінаўся пад неверагоднай колькасцю ежы, згатаванай з прадуктаў свайго фальварка.

Не было адмысловых прысмакаў, далікатэсаў, гаспадары не хваліліся багатай сервіроўкай, але затое шанавалі гасціннасць, сардэчнасць, жаданне падзяліцца дарамі Божымі з усімі [3, с. 125]. Мемуарыстка піша: «Дробная шляхта благаслаўляла гасціннасць дому. Нават калі пасля абеду разыходзіліся па групках, гаспадыня пасылала то мёду, то піва, каб не бавіліся насуха і бачылі, што пра іх дбаюць» [3, с. 225].

Такія нядзельныя абеды, якія гуртавалі ўсю навакольную шляхту, Е. Фялінская апісвае яркімі, сакавітымі фарбамі, не адмаўляючы сабе ў задавальненні спыняцца на найбольш каларытных шляхецкіх постацях. Формы бытавога жыцця мяняліся літаральна на вачах.

Пісьменніца параўноўвае гаспадарку Галынкі з бяздоннай бочкай, у якой ніхто не бачыў пустога дна. Куды ж падзелася былое багацце і дабрабыт потым? «Здавалася, што раней ламалі галаву, як бы найбольш спажыць дароў Божых. Як іх найбольш зашчадзіць, стала клопатам пазнейшых гаспадароў», – піша аўтарка [3, с. 236].

Аўтарка дзённікаў удала ўплятае факты ўласнай біяграфіі ў шматкаляровае і стракатае палатно тагачаснага жыцця, ствараючы калейдаскоп з разнастайных гісторый і аповедаў, што надае твору аб’ёмнасць і стэрэаскапічнасць. Апісальна-ўспамінальная плынь суседнічае са шматлікімі дыялогамі і ўнутранымі маналогамі-роздумамі аўтаркі. Філасофскія абагульненні і дыдактычныя разважанні спалучаюцца ў творы з яркай эмацыянальнасцю і лірызмам.

У другой частцы «Успамінаў» Е. Фялінская вельмі яскрава адлюстроўвае той зменлівы час, які прыйшоўся на яе жыццё. Яна піша, што ў краіне пачаўся вялікі неспакой пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай, падчас паўстання Т. Касцюшкі, і ніхто не ведаў, што цяпер рабіць. Трывога, страх агарнулі ўсіх, людзі кідалі свае пасады і ўцякалі часта не ведаючы куды, проста куды вочы глядзяць. З гарадоў уцякалі ў вёскі, з вёсак у лес. І маці Евы была так узрушана, што пакінула ўласны дом, хаваючыся, дзе толькі магла. Прыгнечаная, яна паехала да Узнобіі, сваёй старэйшай сястры, там і з’явілася на свет Ева Фялінская 26 снежня 1793 года.

У выніку бацька Евы застаўся без пасады, бо яна была ліквідавана. Сям’я засталася без прытулку, у якім маглі б дачакацца лепшых часоў, аднак, дзякуючы спачуванню і добразычлівасці сяброў, сям’і быў ахвяраваны дом у Цяцяроўцы, пакуль не раз’ясніцца справа на дзяржаўным гарызонце. Праз нейкі час, заўважыўшы, што ўсталёўваецца нейкі парадак, бацька вярнуўся ў Навагрудак да ранейшага занятку. І нанова распачаў гаспадарку, ад якой не засталося і рэшткаў.

Праз два гады пасля нараджэння дачкі, прыйшоў на свет яе брат Юльян. Бацькам было вельмі цяжка пракарміць сябе і дзяцей, але, нягледзячы на туляцтва, нястачы, маці першы перыяд свайго замужжа ўспамінала як час найлепшы і найшчаслівейшы ў жыцці, бо потым насталі яшчэ цяжэйшыя выпрабаванні і клопаты.

Бацькі змянілі жыхарства і пераехалі з Навагрудка ў Слуцк. У дарозе яе бацька прастудзіўся. Е. Фялінская піша, што не ўяўляла сабе твару таты, але памятала, як сядзеў ён на крэсле, павярнуўшыся спіной да пакою, апрануты быў цалкам у белае.

Быў яшчэ адзін малюнак, які жыва захаваўся ў памяці Евы: «Бацька яе ляжаў на катафалку, апрануты ў доўгую сукню з фіялетавай бліскучай матэрыі. Тая сукня, пашытая як мяшок, была сабрана каля шыі, была такая доўгая, што закрывала ногі». Пра гэта пісала Е. Фялінская ў другой главе «Успамінаў».

З аналізу «Успамінаў» можна зрабіць выснову пра постаць аўтаркі ў дадзеным творы. Е. Фялінская з'яўляецца тыповым прадстаўніком свайго часу, сваёй эпохі, але разам з тым гэта асоба незвычайнай трываласці, мужнасці, якой хапіла моцы перажыць усе цяжкія выпрабаванні лёсу і стварыць выдатныя мемуары. Гэта неацэнны скарб, па якім зараз даследчыкі могуць вывучаць гэтую эпоху.

Твор, бясспрэчна, мае мастацкую вартасць – Е. Фялінская выкарыстоўвае сродкі стварэння вобразнасці, бо думае пра чытача, для якога піша. Яе тэксты лёгка ўспрымаюцца, нягледзячы на тое, што шмат часу мінула з моманту іх напісання. Е. Фялінская ўздымае балючыя пытанні грамадства сваёй эпохі, чым і можна патлумачыць такую папулярнасць яе твораў у той час.

Дзякуючы ўспамінам Е. Фялінскай сучасныя навукоўцы – гісторыкі, літаратуразнаўцы, этнографы – могуць лепш зразумець XVIII–XIX стагоддзі, бо не існуе адной літаратурнай крыніцы, дзе змешчана ўсё пра эпоху. Для стварэння поўнай карціны неабходна збіраць розны архіўны і літаратурны матэрыял. Мемуарны твор Евы Фялінскай як раз і з'яўляецца адным са значных складнікаў у стварэнні агульнай характарыстыкі той неспакойнай эпохі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


3. *Бурдзялёва І. А.* Рэпрэзентацыя гістарычнай памяці ва «Успамінах» Евы Фялінскай // Вестн. МГЛУ. Сер. 1, Филология. 2011. № 3 (52). С. 122–123.
4. *Мальдзіс А.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мінск: Нар. асвета, 1969.
5. *Fielińska E.* Pamiętniki z życia: w 3 t. Ser. 1. T. 1. Wilno: [s. l.], 1856.